## Кніжніца з Сяльца

***Ёсць геніяльныя пісьменнікі, а ёсць і геніяльныя чытачы. У Яўгеніі Барысаўны Кулевіч хобі даволі арыгінальнае – яна называе сябе бібліёграфам. Але не атаясамлівае сваё захапленне з прафесійнай дзейнасцю спецыялістаў па ўліку і класіфікацыі кніжнай прадукцыі. Яна – зацікаўленая, апантаная чытачка, якая заўжды ў курсе падзей літаратурнага жыцця. А слынная паэтка Данута Бічэль справядліва лічыць яе апякункай майстроў беларускага слова.***

Аблятае апошні ліст, восень туманам, нібы коўдрай, ухутвае бяскрайнія войстамскія палі, цяжкія хмары пагрозліва навісаюць над яе хатай, кожны ранак пакідаючы на ганку рэшткі снежнага вэлюму. Набліжаецца яе доўгачаканая пара, калі нішто не будзе замінаць і адцягваць увагу ад любімай справы – чытання і занатоўвання свайго самага запаветнага. Як і позняя пахмурная восень у прыродзе, так і позняя восень жыцця страшыць многіх, толькі не Яўгенію Кулевіч. Калісьці, парабіўшы справы па гаспадарцы, яна ў гэты час мела магчымасць пасядзець спакойна з кнігай у руках. Цяпер, выгадаваўшы дзяцей, дачакаўшыся ўнукаў і праўнукаў, размяняўшы дзявяты дзясятак жыцця, атрымала цудоўную магчымасць заняцца “смакаваннем” літаратурных твораў, а заадно і прааналізаваць сваё жыццё, занатаваць для нашчадкаў самыя каштоўныя набыткі ўласнага лёсу.

У мінулым Яўгенія Барысаўна – настаўніца беларускай мовы і літаратуры. Прайшла ўсе прыступкі педагагічнай лесвіцы, пачынаючы піянерважатай і настаўніцай пачатковых класаў Бубнаўскай школы на Скідзельшчыне і завяршыўшы кар’еру дырэктарам васьмігодкі ў Замосці на Смаргоншчыне. Беларуская мова і літаратура для яе - не проста спецыялізацыя, а прызванне і пакліканне, якім яна верна служыла і працягвае служыць натхнёна і заўзята, імкнучыся перадаць ад свайго гарачага сэрца іскрынкі любові да Слова, якое, як вядома, было напачатку і было ў Бога, і было Богам.

Атрымліваць асалоду ад кніжных скарбаў дадзена не многім. Усе могуць чытаць, але не ўсе здольны не толькі атрымаць эстэтычнае задавальненне, але вынесці ўрок з прачытанага, выкарыстоўваць філасофію і мудрасць кнігі ў штодзённых стасунках. А Яўгенія Барысаўна заўжды імкнулася падзяліцца з іншымі сваімі адкрыццямі і духоўнымі набыткамі. Спачатку з вучнямі і калегамі, пазней - з аднавяскоўцамі, а потым не стрымалася і пачала пісаць у розныя перыядычныя выданні. Яе артыкулы, заметкі, водгукі, успаміны і замалёўку друкаваліся ў “Звяздзе”, “Краязнаўчай газеце”, “Газеце пенсіянера”, “Нашай веры”, “Нашым слове”, “Сямейнай газеце”. Шмат публікацый з’яўлялася на старонках нашай раёнкі “Светлы шлях”. Абразкі, нататкі, нават апавяданні – вось жанры, у якіх піша няштатны карэспандэнт з войстамскага Сяльца.

Пісала жанчына, каб даць выхад апанаваўшым душу эмоцыям і жаданню паведаміць аўтарам, што іх чытаюць і на перыферыі, якую тая ж Данута Бічэль назвала правінцыяй Святога Францыска. Дарэчы, у кнізе прозы Дануты Янаўны пад такой назвай – “Правінцыя Святога Францыска” - трыццаць шэсць старонак аўтарка аддала пад публікацыю ліставанняў з Жэняй Кулевіч.

У тых лістах успаміны пра горкае сірочае жыццё: трохгадовай дзяўчынкай Жэня засталася без бацькі, з матуляй-інвалідам і са старой бабуляй. Калі бабуля памерла, на дзіцячыя плечы лёг цажар клопату па гаспадарцы і адказнасць за нерухомую маці. Матуля як магла імкнулася дапамагаць дачцэ: шыла, вязала, выбрабляла выцінанкі і штучныя кветкі, каб мець нейкі рубель у сямейным бюджэце. Ад маці пераняла Жэня мужнасць і цвёрдасць характару ў пераадоленні цяжкасцей, а яшчэ любоў да кнігі. Згадвае Яўгенія Барысаўна жыццё ў акупацыі, падзеі пасляваеннага жыцця, з удзячнасцю піша пра людзей, што дапамагалі выжываць сіраце і яе хворай маці, а яшчэ пра тых, хто не заставаўся раўнадушным, апякуючыся над яе лёсам, дапамагаючы і матэрыяльна, і добрай парадай ды замаўляючы, дзе трэба за яе слова. Яна цешыцца, што змагла атрымаць адукацыю, што яе дзеці выраслі ў поўнай дружнай і прыстойнай сям’і.

Сын Яўгеніі Барысаўны – музыкант і настаўнік, працуе ў Маладзечанскай школе-інтэрнаце. Дачка – загадчыца аптэкі ў Мінску. Мае наша гераіня траіх унукаў. Дзве ўнучкі падарылі ёй праўнука і праўнучку.

Вартым увагі застаецца і духоўны скарб, назапашаны нашай гераіняй: увекавечаная для дзяцей і нашчадкаў спадчына ў выглядзе двух альбомаў-успамінаў, радаводу, архіваў, розных дакументаў, якія дакладна адлюстроўваюць этапы яе жыцця і жыцця яе мужа – настаўніка-біёлага па адукацыі Віталя Дзям'янавіча. У асобных папках захоўваюцца ўсе яе публікацыі з розных выданняў, якія, на маю думку, яшчэ доўга будуць вылучацца актуальнасцю. Бо заўжды цікава прачытаць успаміны пра старую беларускую вёску і яе людзей, арыгінальныя і часам смешныя дзіцячыя выказванні. Калі раней Яўгенія Барысаўна запісвала "афарызмы" сваіх дзяцей, унукаў, то цяпер прыйшла чарга для праўнукаў. Вуснамі дзіцяці, як вядома, "ісціна глаголіць", вось і сын Віця, на пытанне, кім ён хоча быць, калі вырасце, некалі адказаў: "Кухарчыкам, бо ён на машыне куды хоча, туды едзе заўжды", а Кухарчык на той час быў старшынёй калгаса. А дачка Лена неяк прасіла купіць кнігу пра чарцей у магазіне "Палітычная кніга". Калі Яўгенія Барысаўна падышла з ёй да паліцы, дзе стаяла гэта кніга пра палітычнага дзеяча, то прачытала на вокладцы "Живые черты".

А яшчэ яна піша так званую навуковую працу "Слоўніца", дзе знайшлі прытулак народныя выразы, прыслоўі, тэматычны слоўнік з тэрмінамі, што паступова знікаюць з ужытку. У рукапіснай гэтай працы ёсць выказванні суседак, знаёмых, выпадковых суразмоўцаў, якія нейкім чынам у сваёй гутарковай мове праяўляюць уласную творчасць. Як выказваўся калісьці акадэмік Дзмітрый Ліхачоў, у свеце столькі моў, колькі людзей, таму што кожны чалавек вылучаецца ўласнай лінгвістыкай, прамаўляючы па-свойму. Нормы сучаснай літаратурнай мовы не могуць спыніць разняволеную творчасць людзей, якія на працягу жыцця выпрацоўваюць сваё маўленне, у якіх і гумар, і сарказм, і ўласнае стаўленне да пэўных з'яў грамадства.



Доўгімі вечарамі напярэдадні зімы дапазна свеціцца акенца ў хаце Яўгеніі Кулевіч. Жанчына чытае або піша, імкнучыся пакінуць у сваіх рукапісах пачутыя ад суседак ці ў тэлефоннай размове цікавыя выразы, архаізмы, прыказкі… Няхай як даўжэй свеціцца гэта акенца паходняй у змроку забыцця, надзеяй для вандроўніка, што згубіўся на абсягах мітуслівага свету.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**

**Фота аўтара і з архіва Я. КУЛЕВІЧ.**

**Яўгенія КУЛЕВІЧ – выпускніца Брэсцкага педагагічнага інстытута.**

**І ў полі яна – не зломак.**
**Унучкі з праўнукамі.**